# ...І ПАЭЗІІ ЎЗНЁСЛЫ ДУХ

І слова паэтычнае, калі яно ад душы ідзе і выказае не толькі тое, што хвалюе аўтара, здатнае ўразіць многіх. І не толькі непасрэдна праз чытанне твора. Уважлівей паставішся да яго, праявіш належнае ўменне, і можна зрабіць цікавую інсцэніроўку, што наблізіцца да спектакля. Кожны выканаўца будзе прамаўляць пэўныя эпізоды, а калі твор вялікі памерам, дык і раздзелы, а ў выніку — «дэкарацыі» пачнуць мяняцца. У залежнасці ад таго, хто чытае ўрывак, узнікне адпаведны настрой, выдзеліцца той ці іншы аспект. А менавіта так і сталася, калі студэнты завочнага курса кафедры тэатральнай творчасці Беларускага універсітэта культуры пад кіраўніцтвам выкладчыка Зінаіды Лашчынінай падрыхтавалі спектакль па творах Сяргея Законнікава і Валянціна Лукшы.

У аснову яго былі пакладзены паэма «Чорная быль» С. Законнікава і казкі «Нарачанская чайка» і «Лебядзіная вернасць» В. Лукшы. Здавалася б, яны розныя на змесцу. С. Законнікаў асэнсоўвае пакуты беларускага народа пасля Чарнобыля. В. Лукша ўзнімае традыцыйныя пытанні кахання, даверу, вернасці. А калі разабрацца, дык тэма ў творах абодвух вядомых паэтаў агульная. Гэта тэма Беларусі. Беларусі, што мае багатую гісторыю, і Беларусі, якая праходзіла і праходзіць праз многія выпрабаванні. Таму невыпадкова спектакль вырашылі ладзіць у доме, дзе пануе дух беларускасці — у так званай «Беларускай хатцы». Калі ж дакладней — гэта невялікі дамок, у якім размясцілася частка экспазіцыі Літаратурнага музея М. Багдановіча. Некалі ў ім Максім-Кніжнік кватараваў разам з З. Бядулем. Цяпер «хатка» прытулілася сярод гмахаў-дамоў і знаходзіцца поруч з галоўным корпусам універсітэта.

Шматлікія экспанаты, сярод якіх нямала унікальных, праўдзіва ўзнаўляюць жыццё Беларусі на пачатку нашага стагоддзя, пераконваюць, як шмат рабілася яе нацыянальна свядомымі сынамі ў імя абуджэння, росквіту Бацькаўшчыны. Цяпер іншы час, але турботы ў многім ранейшыя... Каб жыла Беларусь! Каб была свабоднай! Каб пазбавілася розпай пошасці... А сярод яе і самая страшная бяда — чарнобыльскія наступствы.

Студэнтка за студэнткай дэкламуюць радкі паэмы «Чорная быль». Яна — тая праўда, якую трэба ведаць кожнаму. Яна — голас сумлення і паэта і грамадзяніна. Яе радкі блізкія нам, беларусам, бо ў іх — набалелае, у іх тое, пра што нельга маўчаць.

Дзякуючы добра пастаўленай дыкцыі, студэнткі спасцігаюць сэнс паэзіі С. Законнікава, адчуваючы не толькі прама сказанае аўтарам, а і тое, што ўзнікае падтэкстава. І вось ужо чарнобыльская трывога становіцца трывогай нацыянальнай...

Балюча, пакутліва балюча. Узышла «палыновая зорка» над зямлёй... Дарэчы, «Палыновая зорка» называецца і заключны, трынаццаты раздзел твора. Хутчэй



**Выступаюць студэнты-завочнікі**

**Фота Ул. КРУКА**

за ўсё паэт невыпадкова спыніўся на гэтай магічнай лічбе. Ніхто так і не змог дакладна растлумачыць, чаму ва ўсіх народаў нейкае асаблівае стаўленне да «чортавага тузіна»... Ніхто... А як растлумачыць, чаму абрынулася такая трагедыя на шматпакутную Беларусь?!

Пасля ўсяго хочацца чагосьці светлага, радаснага, што нагадала б, наколькі жыццё непаўторнае і як шмат у ім добрага. А што гэта так, і пераконвае казка В. Лукшы «Лебядзіная вернасць». Паэту ўдалося надзіва перакаўча сказаць пра святое пачуццё на зямлі, пра тое, як каханне здатнае перамагчы зло. Дзякуючы задушэўнасці інтанацый казкі, іх спавядальнасці, выканаўцы змаглі дакладна спасцігнуць свет сказанага В. Лукшам, свет яго вобразаў.

З самага пачатку ўзнік належны кантакт паміж сцэнай і невялічкай залай, у якой сабраліся і студэнты, і выкладчыкі.

Прынесла радасць прысутным і другая «дзіўная казка». «Нарачанская чайка» таксама лёгка і хораша ўпісалася ў гэты імправізаваны спектакль. Ладзілася дзейства, што вабіла сваёй першароднасцю, абуджала пачуццё павагі да роднай зямлі.

Працягам гэтага стала сустрэча з вядомым паэтам-бардам, гаспадаром «Беларускай хаткі» Эдуардам Акуліным. Ён расказаў пра сябе і свой шлях у паэзію, выканаў песні, якія добра ведаюць і любяць студэнты.

На завяршэнне госці прыдбалі асобныя выданні, што расказваюць і пра М. Багдановіча, і пра яго музей, а таксама творы слыннага паэта.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**